# ТЭМА ЧАРНОБЫЛЯ Ў ТВОРАХ БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ

*УА "Беларускі дзяржаўны медыцынскі універсітэт"*

*Бычкова М.М., 3к., 309 гр., ЛФ*

*Кафедра беларускай і рускай моў*
*Навуковы кіраўнік – старшы выкладчык Ратынская Н.В.*

Ужо чвэрць стагоддзя вясной мы ўспамінаем трагедыю, якая адбылася ў 1986-ым годзе, аварыю на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі. Дзень дваццаць шостае красавіка ўвайшоў у гісторыю Беларусі і ўсяго чалавецтва як адна з самых трагічных старонак XX стагоддзя. Начны выбух унёс жыццё, здароўе многіх беларусаў. Нават і сёння людзі пакутуюць ад таго выбуху фізічна і духоўна. Для многіх нашых суайчыннікаў Чарнобыль застаецца балючай незагойнай ранай, якая не перастае крывавіць.

Сёння вынікі той жудаснай ночы – гэта боль усёй Беларусі, і таму тэма чарнобыльскай трагедыі стала вызначальнай у нашай паэзіі, увогуле ў літаратуры. Ужо праз некалькі дзён пасля гэтых падзей з вуснаў паэтаў загучалі песні-плачы, рэквіемы.

Зараз мы можам вылучыць чатыры асноўныя тэмы творчасці беларускіх пісьменнікаў:

- тэма бежанства, выгнання з роднай зямлі
- тэма атручанай, мёртвай зямлі
- тэма загубленага, адабранага дзяцінства
- тэма трывожнага роздуму пра будучыню

У сваёй працы паспрабую прааналізаваць тыя вершы, якія найяскравей адлюстроўваюць пачуцці людзей, іх боль і пакуты, якія прынесла разам з сабой аварыя і яе наступствы.

Нам заўжды цяжка пакідаць сваю хату, нават калі мы адлучаемся на некалькі дзён, у сэрцы з'яўляецца трывога. І вось уявіце сабе: праз некалькі дзён пасля жудаснага выбуху пачалося перасяленне трыццацікіламетровай зоны. На мой погляд, найбольш яскрава пакуты бежанцаў і ўвесь цяжар развітання з родным кутам апісвае Генадзь Бураўкін у вершы "Перасяленне":

Нехта галосіць.
А нехта бязладна ляпеча...
Бабка ж Аўдоцця
Ніяк не расстанецца з печчу.
Перамаўляецца з ёй напаўголаса,
Нібы з жывою,
І да ляжанкі хінецца
Сваёю сівой галавою. [1, с. 57]

Рэпазіторый ГрДМУ

У кожнага было сваё асабістае гора, і кожны перажываў яго па-свойму. Бабка Аўдоцця, якая прырасла да гэтага месца, якая нарадзілася тут і, разлічвала памерці, ніяк не магла змірыцца з тым, павінна была з'ехаць адсюль назаўжды. Разам з гэтай хатай, з гэтай печчу яна прайшла праз усё жыццё. Яны бачалі яе шчасце і гора, радасць і слёзы. Усё звязана з яе успамінамі. І вось раптам жанчына павінна пакінуць іх. І менавіта таму Генадзь Бураўкін піша, што яна "перамаўляецца з ёй напаўголаса, нібы з жывою" – гэта яе сяброўка, якая бачыла кожны дзень яе жыцця.

Сапраўды, цяжэй пакідаць сваю Бацькаўшчыну было старым, многія з іх заставаліся жыць у забруджанай мясцовасці, нягледзячы на наказы ўладаў, а нехта пазней вяртаўся дадому. І гэта зразумела, бо яны, як кажуць, прыкіпелі да сваёй хаты, вёскі.

Вось чаму гераіня паэмы Сяргея Законнікава "Чорная быль" "уцякла, як злодзей" у апошні раз пабачыць сваю Бацькаўшчыну перад смерцю:

Вы не лайце, дзеткі... Паглядзець ахвота,
Як тут наша хатка за калючым дротам?"
"Вы не лайце, дзеткі... Добра мне... Паверце...
Хатку паглядзела, можна і памерці..." [2, с. 15]

Там, дзе раней цвілі кветкі, дрэвы шумелі сваім лісцем, там, дзе блакітнае неба адлюстроўвалася ў буйнай рацэ, а крынічныя воды былі найсмачнейшымі, усё атручана. Як жыць пасля таго, як пад радыяктыўнае забруджанне трапілі пяць абласцей Беларусі?! Найбольш атручаным аказаўся поўдзень Гомельскай вобласці.

У сваім вершы "Балада пра Палессе" Віктар Ярац выказвае ўвесь свой боль за Бацькаўшчыну. Ён успамінае прыгожае Палессе, тую ідылію, якая дагэтуль панавала ў тым цудоўным краі. Жалем і горыччу насычаны ён. Зноў і зноў прыходзіць разуменне таго, што ўжо нельга дапамагчы роднай зямлі. Яна забруджана, ніколі не вернеш ты мінулага часу.

Калі б не тая ноч красавіка,
што горыччу дыхнула неспазнанай, –
як і раней, цякла б між траў рака,
як і раней, суніцы спелі б на палянах [4].

Дзеці. Бацькі прысвячаюць ім сваё жыццё, працуюць, каб даць ім усё неабходнае, каб тыя былі самымі шчаслівымі. Але Чарнобыль не пашкадаваў нават іх. Колькі тых, хто ніколі не стане касманаўтам, настаўнікам, доктарам, тых, кто ніколі не стане дарослым? Адзін выбух змяніў усё жыццё. Замест цацак і сяброў шпрыцы, бальнічныя койкі….. і вялікае жаданне пабачыць новы дзень. Сяргей Законнікаў у паэме "Чорная быль" распавядае пра маленькіх ахвяр, якія пакутавалі ад жудаснай хваробы – лейкозу. Маленькім ахвярам Чарнобыля не пашанцавала: замест таго, каб бегаць па сцежках разам з сябрамі, спяваць песні, не ведаючы ніякіх турбот, яны вымушаны кожны дзень



Репозиторий ГрГМУ

змагацца з хваробай.

На зялёнай клумбе – мак чырвоны,
А далей – бетонная сцяна.
Вось і ўвесь пейзаж, які штодзённа
Ім відаць з бальнічнага акна [2, с. 30].

Законнікаў піша, што яны трываюць лепш за дарослых, цярпліва пераносяць увесь цяжар:

Каб не ўчулі, шэпча вінавата:
"Болей не магу я...
Не магу..."[2, с. 35]

Страх перад будучым. Як жыць далей, што будзе з намі? Якім будзе наступны дзень? Гэтыя пытанні атакоўвалі людзей з ўсіх бакоў. Асабліва цяжка было маладым бацькам, дзеці якіх нарадзіліся ў той цяжкі год. Яўгенія Мальчэўская ў вершы "1986" турбуецца наконт свайго маленькага дзіцяці, які нарадзіўся ў той час. Яе абураюць розныя пачуцці: з аднаго боку шчасце, таму што ў яе нарадзіўся сын, з другога – страх: а што з ім будзе.

Адначасова – шчасце і бяда.
Адначасова – радасць і пакута..... [3]

Такім чынам прааналізаваўшы некаторыя вершы, мы прыходзім да высновы, што чарнобыльская трагедыя глыбока закранула фактычна кожнага беларускага літаратара.

Спіс літаратуры


1. Бураўкін, Г. Узмах крыла: новыя вершы / Г. Бураўкін. – Мінск, 1995.
2. Законнікаў, С. І. Лістам дарога запала…выбранае. / С.І. Законнікаў. – Мінск, 2000.
3. Мальчэўская, Е. 1986. / Е. Мальчэўская. – www.Charnobyl.ru
4. Ярац, В. Балада пра Палессе / В. Ярац. – www.Charnobyl.ru


Репозиторий ГрГМУ

## ГІСТОРЫЯ РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСКАЙ ТЭРМІНАЛОГІІ


*УА "Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт"*

*Варанец А.В., 3 к., 2 гр., МПФ*

*Кафедра рускай і беларускай моў*
*Навуковы кіраўнік – старшы выкладчык Варанец В.І.*


Узнікненне і фарміраванне беларускай тэрміналогіі – працяглы і перарывісты працэс. Розныя фактары, як адмоўныя, так і станоўчыя, на працягу стагоддзяў уплывалі на яе развіццё. Так, у XIV – XVI стст. фарміраванню беларускай тэрміналогіі садзейнічалі наступныя